Проведенный анализ научно-методической литературы, концептуально-нормативных документов, изучение проблемы в практической деятельности показывают, что формирование готовности к выбору профессии в сфере правоохранительной деятельности является важной и социально значимой задачей. Правоохранительная деятельность достаточно специфична. В этой связи возникает потребность подготовки будущих специалистов данной сферы еще в период их обучения в учреждениях общего среднего образования.

УДК 930 + 378

***А.М. Сувалаў***

## ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ ЭТНАГЕНЕЗУ БЕЛАРУСАЎ У КАНТЭКСЦЕ ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ГІСТОРЫКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ»

Ва ўмовах сучаснага інфармацыйнага мультымедыйнага асяроддзя, калі на прасторах інтэрнэту можна знайсці значную колькасць матэрыялаў не столькі навуковага, колькі навукова-папулярнага і, нават, папулісцкага характару, важнае значэнне набывае методыка падачы вучэбных матэрыялаў навучэнцам.

Праблема этнагенезу з'яўляецца адной з цэнтральных у гістарыяграфіі любога народа. І беларусы ў гэтым плане не складаюць выключэнне. Паміма ўласна навуковай праблемы этнагенез, а дакладней, трактоўкі этнагенезу маюць надзвычай істотнае значэнне пры пабудове логікі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Гісторыка-патрыятычнае выхаванне» ды іншых вучэбных дысцыплін сацыяльнай накіраванасці.

Агульнавядома, што існуе цэлы шэраг трактовак этнагенезу і этнічнай гісторыі беларусаў. Сярод найбольш вядомых і пашыраных ва ўсведамленні грамадскасці неабходна ўзгадаць: велікарускую (А.І. Сабалеўскі, І.І. Сразнеўскі, У.І. Даль, М.П. Пагодзін), яе варыяцыю, – «заходнерусізм» (К. Гаворскі, А. Сапуноў, М. Каяловіч, С. Кавалюк, Л. Саланевіч, П. Бывалькевіч, А. Уруцэвіч), польскую (Л. Галамбёўскі, І. Штрытар, С. Ліндэ, А. Рыпінскі), канцэпцыю Я.Ф. Карскага і М.В. Доўнар-Запольскага, «крывіцкую» канцэпцыю В. Ластоўскага (Уласта), «новую канцэпцыю паходжання Беларусі» М.Ф. Піліпенкі і інш.

Калі правесці першасную класіфікацыю названых канцэпцый і тэорый, то для нашага разгляду лічым магчымым падзяліць іх на дзве катэгорыі: уласна навуковыя і ненавуковыя (створаныя не для вырашэння навуковай праблемы, а для ідэалагічнага абгрунтавання пэўных палітычных рашэнняў або працэсаў). Таму да ўласна навуковых можна аднесці канцэпцыю этнагенезу Я.Ф. Карскага і М.В. Доўнар-Запольскага, канцэпцыю М.Ф. Піліпенкі. А да ненавуковых – велікарускую, польскую і «крывіцкую» канцэпцыі. Асобна неабходна падкрэсліць, што любая навуковая канцэпцыя аб'ектыўна мае і свой ідэалагічны змест. Адпаведна і ненавуковыя канцэпцыі і тэорыі маюць сваё навуковае абгрунтаванне і напаўненне.

Для лепшага разумення вышэйпададзенага нагадаем дыялектыку з'яўлення і развіцця пануючых канцэпцый этнагенезу беларусаў. Апусцім самы першы этап з'яўлення ўяўленняў пра этнагенез і этнічную гісторыю нашых продкаў. Малая колькасць першакрыніц і адсутнасць іншых матэрыялаў, з дапамогай якіх стала б магчымай якасная ацэнка працэсу фарміравання ўяўленняў навукоўцаў і шырокай грамадскасці этнагенезу беларусаў, магла б прывесці да шматлікіх дапушчэнняў і малаабгрунтаваных тэорый. Больш варта казаць пра час, калі фарміруецца навука ў яе сучасным разуменні, калі праблема этнагенезу беларусаў становіцца аб'ектам самастойнага вывучэння.

Таму першай (па часе свайго ўзнікнення) стала велікаруская канцэпцыя этнагенезу беларусаў. Яна фарміруецца як вынік запатрабавання навукова абгрунтаваць права на ўключэнне зямель беларусаў у склад Расійскай імперыі. Галоўны тэзіс указанай канцэпцыі – беларусы не ёсць самастойны народ. Яны толькі частка рускага (велікарускага) народа, якая працяглы час знаходзілася пад іншаземным літоўскім, а затым польскім гнётам (ігам). Таму ўсе нацыянальныя асаблівасці беларусаў не з'яўляюцца вынікам развіцця асобнага народа, а гэта ёсць іншаземныя наслаенні і ўплывы. Адсюль вынікае нібыта лагічная выснова аб неабходнасці правядзення палітыкі па русіфікацыі «нашых паўночна-заходніх ускраін», якія спрадвеку належалі Русі (а адпаведна і яе пераемніцы – Расіі).

«Крэсамі ўсходнімі», ускраінамі свайго народа, – у дадзеным выпадку польскага, – трактавала беларусаў і польская канцэпцыя. Сутнасць тая ж, што і ў велікарускай канцэпцыі: беларусы не самастойны этнас, а частка польскага народа, які размаўляе на дрэннай польскай мове. Таму задача патрыётаў – максімальнае пашырэнне ўласна польскай мовы і традыцый на гэтых землях («няхай маці не дасць грудзей сваіх малому, покуль па-польску не папросіць»). Іншымі словамі, прапаноўвалася праводзіць тую ж палітыку дэнацыяналізацыі беларусаў, але ўжо ў варыянце апалячвання.

Сярод канцэпцый этнагенезу беларусаў, якія ўзніклі ў сувязі з палітыка-ідэалагічнымі запатрабаваннямі, а не як вынік навуковага вывучэння праблемы можна ўзгадаць «крывіцкую» канцэпцыю В. Ластоўскага. Канцэпцыя ці тэорыя стала спробай супрацьпаставіць аўтарам велікарускай і польскай канцэпцый ідэю этнічнай самастойнасці беларусаў як ад велікарусаў, так і ад палякаў. Сваю пазіцыю В. Ластоўскі абгрунтоўваў праз вывядзенне паходжання нашых продкаў ад самых старажытных славянскіх насельнікаў Беларусі – крывічоў. У гэтым плане ўказаныя погляды пераклікаюцца з пазіцыямі аўтараў першай навуковай канцэпцыі этнагенезу беларусаў Я.Ф. Карскага і М.В. Доўнар-Запольскага. Але паміж імі існуе істотная розніца: пазіцыі Я.Ф. Карскага і М.В. Доўнар-Запольскага сталі вынікам грунтоўных навуковых даследаванняў па разглядаемай праблеме этнагенезу беларусаў, паступовы адыход ад велікарускай канцэпцыі этнагенезу беларусаў і яе мясцовага варыянта ў выглядзе «заходнерусізма», а В. Ластоўскі – гэта, у першую чаргу, палітык, і толькі потым – аўтар першага і адзінага за ўсю гісторыю царскай Расіі падручніка па гісторыі Беларусі, выдадзенага на беларускай мове.

Асобна адзначым, што пры выкладанні гістарыяграфіі праблемы этнагенезу беларусаў на прыкладзе палітычна і ідэалагічна ангажаваных велікарускай, польскай і «крывіцкай» канцэпцый, важна карэктна ўказаць на іх сутнасць і паказаць наву-

ковыя асновы іх крытыкі савецкімі і айчыннымі даследчыкамі. Апошняе дазволіць пазбегнуць папулізму і актуалізацыі сутнасці ўказаных канцэпцый для сучаснасці, у больш пераканаўчым варыянце падаць сучасныя погляды і падыходы айчынных і замежных аўтараў на праблему этнагенезу беларусаў.

Таксама метадалагічна важна, з нашага пункту гледжання, звяртаць увагу навучэнцаў на ўказанае вышэй для лепшага засваення імі разглядаемага матэрыялу, а таксама і фарміравання ў іх кампетэнцый самастойнага мыслення і аб'ектыўнай ацэнкі любой разглядаемай тэмы.

Такім чынам, пры выкладанні матэрыялу, які звязаны з аналізам поглядаў і падыходаў розных аўтараў на этнічнае паходжанне беларусаў, трэба ўлічваць наступныя моманты. Па-першае, вызначаць мэты выкарыстання пэўным аўтарам матэрыялаў, якія тычацца этнагенезу беларусаў. Па-другое, пры выяўленні прыкладнага характару інтарэсу, вызначаць асноўную ці дамінуючыя мэты выкарыстання праблемы этнагенезу беларусаў. Па-трэцяе, даступна, з улікам падрыхтоўкі і ўзроставых асаблівасцяў аўдыторыі паказаць мэты выкарыстання ўказаных матэрыялаў. Пры гэтым, без неабходнасці не мае сэнсу праводзіць змястоўны навуковы аналіз выкарыстоўваемых аўтарам матэрыялаў, паколькі такая методыка можа прывесці да штучнага надання поглядам разглядаемага аўтара навуковасці, ці навуковай вартасці яго пазіцыі.

Падводзячы высновы вышэйпададзенаму, падкрэслім важнасць выкарыстання навуковых матэрыялаў па гістарыяграфіі праблемы этнагенезу беларусаў пры правядзенні працы з навучэнцамі ў плане фарміравання ў іх навуковых уяўленняў пра адну з цэнтральных праблем гісторыі беларускага народа, іх патрыятычнага выхавання. Недапушчальнасць скочвання пры гэтым у папулізм, з выкарыстаннем стандартных і састарэлых клішэ часоў «халоднай вайны» пасляваеннага часу, ці яшчэ больш старажытных часоў раздзелаў Рэчы Паспалітай і знаходжання нашых зямель у складзе Расійскай імперыі. Не менш важна пры разглядзе ўказанай тэматыкі правільна расстаўляць акцэнты ў паказе істотнай розніцы паміж такімі з'явамі, як патрыятызм і нацыяналізм. Арыентацыя навучэнцаў на пазітыўнае стаўленне да мінулага ўласнага народа, якое, у сваю чаргу, павінна спрыяць разуменню імі патрыятычных пачуццяў суседніх народаў у дачыненні да іх уласнай Радзімы.

УДК 378.016:159.9

***Е.Г. Терешенко***

## ПОДГОТОВКА СПЕЦИАЛИСТОВ ДЛЯ УГОЛОВНО-ИСПОЛНИТЕЛЬНОЙ СИСТЕМЫ И ЕЕ ВЛИЯНИЕ НА ЭФФЕКТИВНОСТЬ ИСПОЛНЕНИЯ НАКАЗАНИЯ В ВИДЕ ЛИШЕНИЯ СВОБОДЫ

На современном этапе подготовка специалистов для уголовно-исполнительной системы на базе уголовно-исполнительного факультета (УИФ) Академии МВД осуществляется по специализации «Уголовно-исполнительная деятельность» специальности «Правоведение». При помощи полученных знаний, сформированных умений и навыков в период обучения, выпускники УИФ становятся специалистами и после успешного окончания направляются к первому месту службы, в котором назначаются, как правило, на должности подразделений оперативно-режимной работы, исполнения приговоров (специальные отделы, отделения, группы), организации исправительного процесса. Вместе с тем стоит отметить, что для повышения эффективности исполнения наказания представляется актуальным вопрос подготовки на УИФ специалистов в области психологии и педагогики (например, по специальности «Практическая психология» с дальнейшим присвоением квалификации «Педагог-психолог»).

По мнению А.Н. Пастушени, эффективное осуществление уголовно-исполнительной деятельности требует четкого понимания психических явлений, присущих людям, с которыми сотрудники правоохранительных и правоприменительных органов взаимодействуют на профессиональном уровне. На основе этих знаний возможна психологически оптимальная реализация профессиональных функций, что позволяет достигать необходимого эффекта от исполнения наказания в виде лишения свободы.

Представляется целесообразным расширить круг сотрудников, которые могли бы оказать необходимое психологическое воздействие. Учитывая тот факт, что психологическое воздействие оказывает непосредственное влияние на сознание осужденных, нельзя не согласиться с тем, что его качество влияет на эффективность исполнения наказания в виде лишения свободы. Вряд ли можно оценить ее как средство, имеющее меньший эффект при достижении целей исполнения наказания, чем режим, воспитательная работа, общественно полезный труд, получение осужденными образования, общественное воздействие. Вместе с тем стоит понимать, что психологическое воздействие коррелирует со средством исправления осужденных в виде воспитательной работы с осужденными: невозможно достичь желаемого педагогического эффекта без понимания психологии.

Мы полагаем, целесообразно внести в систему подготовки курсантов УИФ некоторые изменения. Это обоснованно тем, что эффективное исполнение наказания требует наличия у сотрудника учреждения уголовно-исполнительной системы комплекса знаний не только в области права, но и в области психологии и педагогики, применяя который он мог бы проходить службу в любом из подразделений, непосредственно взаимодействующих с осужденными. Исправление осужденного предполагает в первую очередь работу с его сознанием, в котором формируется готовность к ведению правопослушного образа жизни и дальнейшей реинтеграции в общество. При этом определяющим является понимание того, что ведение правопослушного образа жизни должно быть не следствием страха перед наказанием за новое преступление, а осознание недопустимости совершения преступления исходя из комплекса сформированных в процессе исполнения наказания положительных ценностей и антиценностей (неприятие преступного образа жизни, аморальных влечений, жизни в условиях лишения свободы и т. д.).

Учитывая, что исправительная функция исправительного учреждения является целевой, а необходимость наличия у специалистов квалификации в области психологии и педагогики сложно переоценить, нами предлагается ежегодно осуществлять набор и обучение групп курсантов УИФ по специальности «Практическая психология» с дальнейшим присвоением